**Галоўны** алтар – сэрца касцёла / падрыхт. В. Вішнеўская // Міёрскія навіны. – 2016. – 7 чэрв. – С. 7.

## ГАЛОЎНЫ АЛТАР – СЭРЦА КАСЦЁЛА

Ля Міёрскага касцёла часта можна бачыць аўтобусы з турыстамі, вела- і мотападарожнікаў. Усе спыняюцца, каб памаліцца, зрабіць фотаздымкі на памяць ці проста палюбавацца веліччу святыні. Яе адбітак адлюстроўваецца ў азёрнай роўнядзі, а вежы бачныя за некалькі кіламетраў ад горада.

Гэты артыкул распачне цыкл пра касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі і святога Язафата Кунцэвіча, біскупа і мучаніка. Пабудаваны ён у 1907 г. ксяндзом Юзафам Бародзічам і парафіянамі. У наступным годзе адзначыць 110 год.

Пры ўваходзе ў касцёл позірк міжволі скіроўваецца на алтар, дзе прабывае Бог, дзе складаецца ахвяра праз малітву святара і ў супольнасці вернікаў. У Міёрскай святыні найцудоўнейшае месца, як і ў кожным «Доме Божым», яго сэрца – прэзбітэрый з галоўным алтаром.

Расказвае пробашч парафіі Крыштаф Міянкін:

– Уверсе крыж, пад ім выява птушкі пелікана з птушанятамі, якія дзяўбуць ёй грудзі, адкуль прасочваецца кроў. У прыродзе, калі пелікану няма чым карміць дзяцей, ён дае ім сваю кроў, каб толькі жылі. Гэтая птушка – сімвал Хрыста, які праліў сваю кроў і аддаў жыццё за людзей. Таму знаходзіцца ў верхняй частцы алтара.

Далей фігура святога Язафата, біскупа і мучаніка, які з'яўляецца апекуном парафіі. Ён у літургічнай вопратцы з пальмай у адной руцэ, што сімвалізуе пакутніцтва, з кнігай у другой – як духоўны настаўнік.

Да нядаўняй пары ў касцёле маліліся на тры часткі Святога Ружанца – Радасную, Балесную і Хвалебную, а кожная складаецца з пяці таямніц, у якіх прыгадваецца жыццё Езуса ад моманту зачацця і да хвілін смерці і ўваскрашэння. У галоўным алтары таксама адведзена месца для частак Ружанца. Тры разы за літургічны год яны змяняюцца, што заўважна кожнаму пільнаму верніку. На час Адвэнту спецыяльнымі механізмамі людзям адкрываюцца таямніцы Радаснай часткі – звеставанне Найсвяцейшай Панне Марыі, адведзіны Паннай Марыяй святой Альжбеты, нараджэнне Збаўцы нашага Езуса Хрыста, ахвяраванне Хрыста ў святыні, Езуса знаходзяць у Іерусалімскай святыні; на Вялікі Пост – Балесная: малітва Езуса Хрыста ў садзе Аліўным, бічаванне, укаранаванне Езуса цернем, Езус нясе крыж на гару Кальварыйскую, укрыжаванне і смерць; у ноч з Вялікай Суботы на Нядзелю Уваскрашэння – Хвалебная: з мёртвых паўстанне Хрыста, унебаўшэсце Хрыста, спасланне Духа Святога, унебаўзяцце, укаранаванне Найсвяцейшай Панны Марыі, якія мы можам бачыць зноў жа да пачатку Адвэнта.

Актуальнасць Ружанцовай малітвы падкрэсліў святы Папа Ян Павел ІІ. У 2002 годзе ён выдаў апостальскі ліст «Rosarium Virginis Mariae», у якім запрасіў нанова адкрыць Ружанец і дапоўніў яго новай часткай Святла і таямніцамі – хрост Пана Езуса ў Іардане, Езус аб'яўляе сябе на вяселлі ў Кане, абвяшчэнне Валадарства Божага і заклік да невяртання, перамяненне Пана на гары Табор, устанаўленне Эўхарыстыі. Гэтыя падзеі звязаныя з дзейнасцю Хрыста. У касцёле была толькі таямніца «ўстанаўленне Эўхарыстыі», што размешчана ўнізе галоўнага алтара. Таму за ахвяраванні зроблены яшчэ чатыры, якія бачныя зараз наваконных вітражах у прэзбітэрыі.

Хто не ведае, Ружанцам завецца нізка асаблівым чынам змацаваных пацерак (драўляных, касцяных, бурштынавых і інш.), на кожную з якіх асобная малітва. Ружанец быццам «вянок ружаў», сплецены з найдаражэйшых малітваў: «Ойча наш», якой навучыў нас сам Пан Езус, і «Вітай, Марыя», якою віталі Марыю Божы пасланец арханёл Габрыэль і святая Альжбета, маці Яна Хрысціцеля.

Табернакль – месца, дзе захоўваюцца святыя дары, дзе прабывае Езус. У касцёле Хрыстос тут знаходзіцца ўвесь час і Яго пад выглядам хлеба і віна тут хаваем. У Найсвяцейшым Сакраманце, як у сейфе, захоўваюцца дары – Цела і Кроў Хрыста, іх у час імшы раздаюць людзям у камуніі. Гэта цэнтральная і галоўная частка вялікага алтара.

У выніку Другога Ватыканскага Сабора, які доўжыўся з 1962 г. і да 1965 г., прыняты шэраг важных дакументаў. Тады змянілася і літургія ў касцёле: святары сталі тварам да людзей адпраўляць імшу, а раней скіроўвалі позіркі да галоўнага алтара. Тады ж сабор дадаў ахвярны алтар, які яшчэ завецца алтар Сабораў. Ён вырабляецца з каменя, у нашым касцёле – у выглядзе стала з граніту, бывае проста каменная глыба. На гэтым алтары адбываецца Найсвяцейшая ахвяра. Калі пачынаецца служба, ад слоў «У імя Айца, і Сына, і Духа Святога…» мы ўсю ўвагу канцэнтруем на ахвярным алтары, дзе складаем хлеб і віно з вадой, якія падчас малебну змяняюцца ў Цела і Кроў Хрыста. Гэта ахвярнік, на якім Хрыстос прыходзіць да нас. На алтары Сабораў сканцэнтравана ўся ўвага да заканчэння службы.

З левага боку на ахвярным алтары ў рэліквіярыі – мошчы Язафата Кунцэвіча, скульптура святога размяшчаецца ў галоўным алтары. Цела яго пахавана ў Рыме. Гэта адзіны архібіскуп у свеце, увекавечаны ў Базіліцы святога Пятра, там знаходзяцца магілы толькі Папаў Рымскіх. Архібіскуп Станіслаў Новак, ардынарый Чэнстахоўскі з Польшы, у 2004 годзе прывёз з Рыма ў Міёры рэліквіі святога Язафата. Сапраўднасць пацвярджае дакумент з яго подпісам. Іх ушаноўваюць у нашым касцёле кожную пятніцу раніцай і ўвечары пасля службы.

У ахвярным каменным стале Саборнага алтара адтуліна, дзе закладзены рэліквіі беларускага святога Андрэя Баболі, таксама мучаніка, які загінуў за веру на Палессі. На рэліквіярыі стары надпіс, але не захавалася ніякіх папер, як да нас трапілі мошчы. Ад парафіян даведаўся, што раней яны выстаўляліся ў маленькай грабніцы на адным з бакавых алтароў.

У прэзбітэрыі варта звярнуць увагу яшчэ на дзве рэчы. Каля ахвярнага алтара стаіць крыж, а ля яго падсвечнік з трыма свечкамі. Хрыстос – жывы агонь, таму яны павінны гарэць падчас службы. Для гэтага дастаткова дзвюх свечках, у нас – тры.

Над прэзбітэрыем гарыць вечная лямпа. У святынях такіх можа быць і больш. Асабліва заўважная ў час Раратняй Святой Імшы. Раніцай у касцёле цёмна, а чырвоны агеньчык азначае, што ў святыні ёсць Найсвяцейшы Сакрамант і Езус Хрыстос. Так арыентуемся, станавіцца на калені ці не трэба.

Сімвалічнае значэнне лямпы – вечны агонь веры ў Хрыста, што разганяе цемру зла і нявер.

У прэзбітэрыі ля галоўнага алтара яшчэ на сцяне размешчаны гербы, пра іх падрабязней пазней.

**Падрыхтавала Вольга Вішнеўская.**